Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт”

Д. У. Дук, А. А. Шышкоў

# МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ

па падрыхтоўцы, афармленні і абароне дыпломнай работы
для студэнтаў спецыяльнасцей 1-21 03 01 “Гісторыя”,
1-02 01 02-04 “Гісторыя. Англійская мова”

Наваполацк
ПДУ
2013

УДК 93(075.8)
ББК 63я73

Ухвалена і рэкамендавана да выдання метадычнай камісіяй
гісторыка-філалагічнага факультэта ў якасці метадычных указанняў
(пратакол № 11 ад 31.05.2010)

Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

канд. філал. навук, дац., дэкан гіст.-філал. факультэта Н. Б. ЛЫСОВА;
канд. гіст. навук, дац. каф. айчыннай і ўсеагульнай гісторыі У. А. ЛОБАЧ

© Дук Д. У., Шышкоў А. А., 2013
© УА “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт”, 2013

## 1. Агульныя палажэнні

Дадзеныя метадычныя ўказанні складзены на аснове Інструкцыі па падрыхтоўцы, афармленні і прадстаўленні да абароны дыпломных праектаў (работ) у вышэйшых навучальных установах (№ 356 ад 27 чэрвеня 1997 г.); метадычнай інструкцыі "Дипломное проектирование. Новополоцк. Дата введения 2007-02-07"; "Як падрыхтаваць і абараніць дыпломную работу па спецыяльнасці "Гісторыя"?": метадычныя парады для студэнтаў спецыяльнасці Г 05.01 (Наваполацк, 1999).

Дыпломная работа – гэта выпускная кваліфікацыйная работа студэнта, прызначаная для аб'ектыўнага кантролю ступені сфарміраванасці ведаў, уменняў і навыкаў вырашаць задачы па відах прафесійнай дзейнасці, устаноўленых адукацыйным стандартам спецыяльнасці, якая прадугледжвае правядзенне аналізу і распрацоўку актуальных пытанняў, праблем у адпаведнай галіне ведаў адпаведна патрабаванням задання на выпускную кваліфікацыйную работу.

Падрыхтоўка дыпломнай работы ўключае ў сябе самастойную даследчую працу, афармленне і перадабарону.

Дыпломную работу неабходна выконваць з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Для выканання дыпломнай работы можа выкарыстоўвацца матэрыял курсавой работы; гэта значыць, тэма ці яе частка паслядоўна распрацоўваецца ў курсавой, а пасля і дыпломнай рабоце з паступовым яе пашырэннем і паглыбленнем.

## 2. Фарміраванне тэм дыпломнай работы і яе напісанне

Тэматыка дыпломных работ павінна быць актуальнай, адпавядаць сучаснаму стану і перспектывам развіцця навукі і па сваім змесце адпавядаць наступным мэтам:

– сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў па спецыяльнасці і выкарыстанне іх для вырашэння канкрэтных прафесійных задач;

– авалоданне методыкай навуковага даследавання, замацаванне навыкаў самастойнай даследчай працы;

– набыццё навыкаў абагульнення і аналізу вынікаў, атрыманых іншымі даследчыкамі;

– выяўленне ўзроўню падрыхтаванасці студэнта для самастойнай работы ва ўстановах адукацыі і навукова-даследчых арганізацыях.

Студэнты маюць права выбару тэмы дыпломнай работы і мовы напісання (беларуская, руская).

Назва працы павінна быць па магчымасці сціслай і дакладна адлюстоўваць змест дыпломнай работы. Назва павінна ўтрымліваць праблемнае пытанне (прадмет) даследавання. У некаторых выпадках для большай канкрэтызацыі дапушчальна дадаць да назвы невялікі (4 – 6 слоў) падзагаловак.

Нельга выкарыстоўваць складаную тэрміналогію. Варта пазбягаць назваў, якія пачынаюцца са слоў “Вывучэнне працэсу...”, “Даследаванне некаторых шляхоў...”, “Некаторыя пытанні...”, “Матэрыялы да вывучэння...”, “Гісторыя ...” і г.д., у якіх не адлюстроўваецца належным чынам сутнасць разглядаемай праблемы, няма дастаткова яснага вызначэння яе мэты.

Пасля абмеркавання тэм дыпломных работ на пасяджэнні кафедры і зацвярджэння на савеце факультэта яны зацвярджаюцца загадам рэктара.

Работа з навуковым кіраўніком вядзецца на працягу ўсяго працэса падрыхтоўкі. Пры гэтым лепш за ўсё прыносіць кіраўніку асобныя раздзелы тэксту. Студэнт павінен падтрымліваць кантакт з навуковым кіраўніком, інфармаваць яго аб выніках сваіх напрацовак, звяртацца па навуковую і метадычную дапамогу.

Калі ў ходзе працы ўзнікае неабходнасць удакладніць, адкарэкціраваць ці змяніць тэму, гэтыя змены вызначаюцца і ўносяцца навуковым кіраўніком для абмеркавання на пасяджэнні кафедры і наступнага ўнясення змен у загад рэктара.

## 3. Змест дыпломнай работы

Дыпломная работа складаецца з наступных раздзелаў:

– тытульны ліст (узор афармлення дадзены ў дадатку А);

– заданне па дыпломнай рабоце (узор афармлення дадзены ў дадатку Б), выдаецца перад пачаткам пераддыпломнай практыкі;

– рэферат (узор афармлення дадзены ў дадатку В);

– змест;

– пералік умоўных абазначэнняў, сімвалаў і тэрмінаў (пры неабходнасці);

– уводзіны;

– асноўная частка (раздзелы, прысвечаныя раскрыццю пастаўленых мэты і задач);

– заключэнне;

– спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры;

– дадаткі (пры неабходнасці).

Усе гэтыя структурныя часткі нумаруюцца.

Нумар на першай старонцы не ставіцца. Уводзіны пачынаюцца **з 5 старонкі** (1 старонка – тытульны ліст, 2 – заданне, 3 – рэферат, 4 – змест).

Камп’ютарныя праграмы, распрацаваныя ў адпаведнасці з заданнем на дыпломную работу, павінны дадавацца да дыпломнай работы на кампакт-дыску (CD) (для студэнтаў спецыялізацыі “Гістарычная інфарматыка”).

Разглядзім больш падрабязна патрабаванні да зместу і афармлення структурных частак дыпломнай работы.

**Уводзіны** – гэта частка дыпломнай работы, дзе абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы, вывучаецца ступень распрацаванасці тэмы ў айчыннай навуцы, месца даследавання ў сучаснай гуманітарыстыцы, навуковая і грамадская значнасць даследавання, фармулююцца мэта і задачы. Звычайна фармулюецца адна мэта работы (супадае з тэмай) і некалькі задач, якія неабходна вырашыць для дасягнення пастаўленай мэты.

Называюцца аб’ект і прадмет даследавання, вызначаюцца межы прадмета даследавання. У сціслай форме адзначаюцца метады даследавання і прынцыпы, на якіх яно пабудавана.

Уводзіны змяшчаюць кароткі гістарыяграфічны агляд, дзе аўтар прыводзіць нарыс асноўных этапаў развіцця навуковай думкі па разглядаемай праблеме. Сцісла, крытычна асвятляюцца работы папярэднікаў. Аўтар павінен акрэсліць тыя пытанні, якія засталіся нявырашанымі і, такім чынам, вызначыць сваё месца ў вырашэнні праблемы. Гэтая частка ўводзін з’яўляецца абавязковай нават пры ўмове наяўнасці асобнага раздзела, прысвечанага гістарыяграфіі. У такім разе ва ўводзінах сцісла пазначаюцца асноўныя накірункі вывучэння праблемы, крыніцазнаўчая база. Спасылкі на крыніцы і асобныя працы гісторыкаў (нават пры пераліку прозвішчаў) ва ўводзінах абавязковыя. Неабходна пазначаць імя і імя па бацьку даследчыка (за выключэннем асобных выпадкаў, калі поўнае імя цяжка вызначыць, альбо пры пазначэнні прозвішчаў замежных аўтараў), пры гэтым ініцыялы павінны размяшчацца перад прозвішчам. Калі называюцца замежныя аўтары, іх прозвішча ў гістарыяграфічным аглядзе перакладаецца, а побач у дужках прыводзіцца напісанне прозвішча ў арыгінале лацініцай, напрыклад: Е. Круппэ (E. Kruppé).

Пры неабходнасці ва ўводзінах называюцца тэрытарыяльныя і храналагічныя межы даследавання са спасылкамі на адпаведныя крыніцы, працы гісторыкаў. Аб’ём уводзінаў не павінен перавышаць 4 – 5 старонак.

**Асноўная частка** дыпломнай работы ўтрымліваецца ў главах (раздзелах), дзе апісваецца выбар накірункаў даследавання, выкладаецца агульная канцэпцыя і апісваюцца асноўныя метады даследавання, пра-

ведзеныя ў ходзе работы тэарэтычныя ці прыкладныя даследаванні, робіцца аналіз і абагульненне вынікаў даследавання.

У раздзелах асноўнай часткі дыпломнай работы з вычарпальнай паўнатой выкладаецца ўласнае даследаванне студэнта з выяўленнем таго новага, што ён уносіць у распрацоўку праблемы. Увесь парадак выкладання матэрыялу павінен быць падпарадкаваны мэце даследавання, сфармуляванай аўтарам. Лагічнасць пабудовы і мэтанакіраванасць асноўнага зместу дасягаецца толькі тады, калі кожны раздзел мае канкрэтнае мэтавае прызначэнне і з'яўляецца базай для наступнага. У дыпломнай рабоце неабходна сцісла, лагічна і аргументавана выкладаць змест і вынікі даследаванняў, пазбягаць залішняга выкарыстання агульных слоў, бяздоказных сцвярджэнняў, таўталогіі, неапраўданага павелічэння аб'ёму дыпломнай работы.

Пры напісанні дыпломнай работы аўтар абавязаны даваць спасылкі на аўтараў і крыніцу, з якой ён выкарыстоўвае матэрыялы ці асобныя вынікі. Цытаванне дазваляецца толькі з выкарыстаннем двукоссяў згодна з правіламі цытавання ў беларускай (рускай) мове. Не дазваляецца кампілятыўны пераказ тэксту іншых аўтараў.

У кожнай главе (раздзеле) варта рабіць кароткія высновы, што дазваляе выразна сфармуляваць вынікі кожнага этапу даследавання і дае магчымасць вызваліць асноўныя вынікі па рабоце ад другасных падрабязнасцяў. Кожны раздзел павінен адпавядаць пастаўленай ва ўводзінах задачы.

**Заключэнне** павінна ўтрымліваць асноўныя вынікі даследавання і вывады, зробленыя на іх аснове. Заключэнне павінна змяшчаць вычарпальны адказ на пастаўленыя пытанні. Магчыма пабудова заключэння на падставе высноў асобных раздзелаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры** павінен утрымліваць пералік крыніц інфармацыі, на якія ў дыпломнай рабоце прыводзяцца спасылкі. Спіс робіцца ў алфавітным парадку. Спачатку прыводзіцца спіс выданняў на беларускай, рускай, украінскай і іншых мовах, якія выкарыстоўваюць кірылічны алфавіт, пасля – польскія, англійскія, французскія і іншыя выданні на мове арыгінала.

**Дадаткі.** Пры неабходнасці ў дадаткі ўключаюць дапаможны матэрыял: графікі, табліцы, ілюстрацыі і да т.п., неабходны для паўнаты ўспрыняцця дыпломнай работы.

## 4. Афармленне дыпломнай работы

**Агульныя патрабаванні.** Дыпломная работа друкуецца на адной старонцы ліста белай паперы фармату А4 паводле ГОСТ 2.301. **Пры камп'ютарным наборы тэкст набіраецца праз множнік 1,1**; шрыфтам

**Times New Roman памер 14 pt без пераносаў**. Параметры палёў: левае – 30 мм, правае – 10 мм, верхняе і ніжняе – 20 мм. У кожным радку павінна быць не больш за 60 – 75 знакаў з улікам прабелаў паміж словамі.

Мінімальны аб'ём дыпломнай работы – 35 старонак тэксту (без уліку дадаткаў і спісу выкарыстаных крыніц), максімальны – 60 старонак. Аптымальны аб'ём дыпломнай работы – 50 старонак. Выяўленыя памылкі, недакладнасці дапускаецца выпраўляць падчысткай ці зафарбоўкай белай фарбай і ўнясеннем на тым жа месцы выпраўленага тэксту рукапісным чынам.

Загалоўкі структурных частак дыпломнай работы "ЗМЕСТ", "УВОДЗІНЫ", "ГЛАВА", "ЗАКЛЮЧЭННЕ" і інш. друкуюць вялікімі літарамі ў сярэдзіне радка. Гэтак жа друкуюць загалоўкі глаў. Слова "ГЛАВА" перад загалоўкам главы як у тэксце, так і ў змесце можа не выкарыстоўвацца. Тэкст асноўнай часткі работы падзяляюць на раздзелы, падраздзелы, пункты і, калі ёсць неабходнасць, падпункты. Загалоўкі раздзелаў друкуюць сіметрычна тэксту вялікімі літарамі без кропкі напрыканцы. Загалоўкі падраздзелаў друкуюць з абзаца малымі літарамі, акрамя першай вялікай. Пераносы слоў у загалоўках не дапускаюцца. Кропка ў канцы загалоўка не ставіцца. Адлегласць паміж загалоўкам і тэкстам павінна быць 1 – 2 інтэрвалы. Падкрэсліваць загалоўкі не дазваляецца.

Кожную структурную частку дыпломнай работы неабходна пачынаць з новага ліста.

Раздзелы павінны мець парадкавую нумарацыю ў межах усёй работы і абазначацца арабскімі літрамі з кропкай у канцы, напрыклад: 1., 2., 3., і г.д. Уводзіны і заключэнне не нумаруюцца. Падраздзелы нумаруюць арабскімі лічбамі, нумар падраздзела складаецца з нумара раздзела і парадкавага нумара падраздзела, падзеленых кропкай, напрыклад: 1.1., 2.2., 2.3. і г.д. Пункты нумаруюць арабскімі лічбамі ў межах кожнага падраздзела. Нумар пункта складаецца з нумара раздзела, падраздзела і парадкавага нумара пункта, падзеленых кропкай, напрыклад: 1.1.1., 1.1.2. і г.д.

Ілюстрацыі (акрамя табліц) абазначаюцца словам "Малюнак" і нумаруюцца паслядоўна арабскімі лічбамі ў межах раздзела, за выключэннем ілюстрацый, прыведзеных у дадатку. Нумар ілюстрацыі павінен складацца з нумара раздзела і парадкавага нумара ілюстрацыі, падзеленых кропкай, напрыклад: Малюнак 1.1., Малюнак 1.2. і г.д. Нумар ілюстрацыі размяшчаюць над малюнкам перад яго назвай. Ілюстрацыі, змешчаныя ў дадатку, пазначаюць асобнай нумарацыяй з дабаўленнем перад лічбай абазначэння дадатка, напрыклад: Малюнак А.3. Слова "Малюнак", нумар і найменне змяшчаюць пасля малюнка і тлумачальных даных, напрыклад, "Малюнак А.1 – План Полацка 1963 года".

Табліцы нумаруюць паслядоўна арабскімі літарамі (за выключэннем табліц, прыведзеных у дадатку) у межах раздзела. У левым верхнім куце табліцы пад адпаведным загалоўкам размяшчаюць надпіс “Табліца” з указаннем нумара табліцы. Нумар табліцы складаецца з нумара раздзела і парадкавага нумара табліцы, падзеленых кропкай, напрыклад: Табліца 1.2. Пры пераносе часткі табліцы на другі ліст над другой часткай табліцы пазначаюць: Працяг табліцы 1.2. Над апошняй часткай табліцы злева пішуць: Заканчэнне табліцы 1.2. Ілюстрацыі і табліцы размяшчаюць пасля першай згадкі пра іх. Калі ў тэксце выкарыстоўваецца толькі адна табліца, то яна пазначаецца “Табліца 1” ці “Табліца 3.1”. Табліцы ў дадатку пазначаюць асобнай нумарацыяй арабскімі лічбамі з дабаўленнем перад лічбай літары дадатку, напрыклад: Табліца А.3. Табліцы суправаджаюцца тэматычнымі назвамі, якія размяшчаюць пасярэдзіне старонкі і пішуць з вялікай літары без кропкі напрыканцы. Назвы ілюстрацый і табліц павінны быць як мага карацейшымі і адлюстроўваць іх змест.

**Спасылкі.** Пры напісанні дыпломнай работы аўтар абавязаны даваць спасылкі на крыніцы і матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца ў даследаванні. Спасылка афармляецца пасля цытаты ў квадратных дужках, напрыклад: [25, с. 17], дзе 25 – нумар крыніцы ў алфавітным спісе, а 17 – нумар цытаванай старонкі. Калі патрабуецца спасылка на некалькі крыніц, то падзелам паміж імі будзе служыць кропка з коскай, напрыклад: [6, с. 54; 34, с. 56; 116, мал. 3]. На дадаткі спасылаюцца такім чынам: (мал. 1.1) альбо (табліца 1.2). У любым выпадку спасылка прыводзіцца на арыгінальнай мове крыніцы, напрыклад [6, р. 54; 34, rус. 56; 116, il. 3]. На архіўныя матэрыялы спасылаюцца так: [15, ф. 2613, воп. 1, спр. 2].

**Нумарацыя.** Нумарацыя старонак даецца арабскімі лічбамі без знака №. Першай старонкай работы з’яўляецца тытульны ліст, які ўключаюць у агульную нумарацыю, але на тытульным лісце нумар старонкі **не ставіцца**. На наступных лістах нумар прастаўляюць на верхнім полі ў правым куце без кропкі ў канцы.

**Спіс выкарыстаных крыніц.** Крыніцы неабходна размяшчаць у спісе ў алфавітным парадку прозвішчаў аўтараў ці загалоўкаў (узор афармлення спісу крыніц прыведзены ў дадатку Г).

**Дадаткі.** Дадаткі афармляюць як працяг дыпломнай работы на наступных яе старонках, размяшчаючы іх у парадку з’яўлення спасылак у тэксце. Кожны дадатак пачынаецца з новай старонкі з указаннем у цэнтры старонкі слова “ДАДАТАК”. Калі ў рабоце больш за адзін дадатак, іх пазначаюць паслядоўна вялікімі літарамі беларускага (рускага) алфавіта,

напрыклад, ДАДАТАК А, ДАДАТАК Б і г.д., за выключэннем літар Е, З, Й, О, Ч, Ь, Ы, Ъ. У дадатку А змяшчаюцца табліцы, у дадатку Б – графікі, у дадатку В – малюнкі, фотаздымкі і г.д., якія могуць быць тэматычна аб’яднаны па розных дадатках.

Да інфармацыі, прадстаўленай у дадатку, студэнты абавязаны даваць спасылкі на крыніцы і матэрыялы. Спасылка афармляецца пасля назвы табліцы, назвы малюнка ці фотаздымка ў квадратных дужках, напрыклад: [25, с. 17], дзе 25 – нумар крыніцы ў алфавітным спісе, а 17 – нумар цытаванай старонкі. Аўтарства ў складанні табліц, малюнкаў, фотаздымкаў студэнта-дыпломніка пазначаецца адпаведным прозвішчам.

## 5. Абарона дыпломнай работы

У адпаведнасці з “Інструкцыяй па падрыхтоўцы, афармленні і прадстаўленні да абароны дыпломных праектаў (работ) у вышэйшых навучальных установах” (№ 356 ад 27 чэрвеня 1997 г.) і метадычнай інструкцыяй “Дипломное проектирование. Новополоцк. Дата введения 2007-02-07”, завершаная дыпломная работа падпісваецца аўтарам і кансультантам (калі ён быў прызначаны) і прадстаўляецца кіраўніку для падрыхтоўкі водгука. Не пазней чым за тры тыдні да абароны дыпломная работа і водгук кіраўніка прадстаўляюцца загадчыку кафедры, які вырашае пытанне аб допуску студэнта да абароны дыпломнай работы. Станоўчае рашэнне загадчыка кафедры фіксуецца адпаведным подпісам на тытульным лісце дыпломнай работы, якая пасля гэтага накіроўваецца на рэцэнзаванне. Пры адмоўным рашэнні пытанне аб допуску да абароны разглядаецца на пасяджэнні кафедры з запрашэннем кіраўніка работы. Пры адмоўным заключэнні кафедры пратакол пасяджэння прадстаўляецца на зацвярджэнне дэкану факультэта, які не дапускае студэнта да абароны і робіць прадстаўленне рэктару аб адлічэнні студэнта з універсітэта.

Рэцэнзент мае права запатрабаваць у аўтара дыпломнай работы дадатковыя матэрыялы па сутнасці выкананай работы. Студэнт павінен азнаёміцца з рэцэнзіяй загадзя, да абароны работы.

Да абароны дыпломнай работы дапускаюцца студэнты, якія паспяхова выканалі вучэбны план і здалі дзяржаўны экзамен па спецыяльнасці.

Абарона дыпломнай работы праходзіць публічна ў Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі (ДЭК). Перад пачаткам работы ДЭК сакратар перадае старшыні ДЭК дыпломныя работы разам з водгукамі кіраўнікоў і рэцэнзіямі. Без водгукаў і рэцэнзій дыпломныя работы да абароны не дапускаюцца.

На адно пасяджэнне выносіцца не больш за 12 дыпломных работ, на абарону кожнай з іх адводзіцца ў сярэднім 30 хвілін. Старшыня аб’яўляе прозвішча, імя і імя па бацьку студэнта, тэму дыпломнай работы, пасля чаго абаронцу даецца слова на 10 хвілін. У прамове студэнт павінен абгрунтаваць актуальнасць абранай тэмы, назваць аб’ект і прадмет даследавання, агучыць высновы і практычныя прапановы. Тэкст выступлення лепш падрыхтаваць загадзя і ўзгадніць яго з навуковым кіраўніком. Своечасова трэба паклапаціцца аб наяўнасці і якасці ілюстрацыйнага матэрыялу: дыяграм, схем, карт, мультымедыйных сродкаў, якія дазваляецца выкарыстоўваць падчас абароны дыпломнай работы.

Пасля выступлення дыпломнік адказвае на пытанні членаў ДЭК. Пытанні могуць як датычыць непасрэдна тэмы выкананай работы, так і насіць агульны характар у межах дысцыплін спецыяльнасці і спецыялізацыі, вывучаемых на працягу навучання ва ўніверсітэце. Пасля членаў ДЭК з дазволу старшыні пытанні могуць задаваць усе прысутныя на абароне. Студэнт павінен даваць адказы на пытанні адразу.

Затым выступае рэцэнзент альбо зачытваецца яго рэцэнзія. Аўтар павінен адказаць на дадзеныя ў рэцэнзіі заўвагі.

Пасля гэтага з водгукам на дыпломную работу выступае кіраўнік альбо пры яго адсутнасці зачытваецца водгук.

Напрыканцы абароны дыпломнік атрымлівае заключнае слова, у якім мае магчымасць удакладніць сваю пазіцыю па абмяркоўваемай праблеме і працэсе напісання работы.

Вынікі абароны дыпломных работ падводзяцца на закрытым пасяджэнні ДЭК і вызначаюцца экзаменацыйнымі адзнакамі.

Пасля абароны дыпломная работа захоўваецца ва ўніверсітэце на працягу пяці гадоў.

**ДАДАТАК А**

**Форма тытульнага ліста дыпломнай работы**

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**“ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ”**

**Гісторыка-філалагічны факультэт**
**Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі**

ДАПУШЧАНА ДА АБАРОНЫ
Загадчык кафедры

__________ ____________________
подпіс    ініцыялы і прозвішча

“____” ______________ 20___ г.

**ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА**

“__________________________________________________”
назва тэмы

Спецыяльнасць 1-21 03 01 “Гісторыя”*
найменне спецыяльнасці

Спецыялізацыя 1-21 03 01-01 “Гісторыя Беларусі”**
найменне спецыялізацыі

Студэнт-дыпломнік
групы ____________ __________ __________________________
подпіс, дата    імя, імя па бацьку і прозвішча

Кіраўнік __________ __________________________
подпіс, дата    ініцыялы і прозвішча, вучоная ступень, званне

Кансультанты:
Па раздзеле _________ __________ __________________________
подпіс, дата    ініцыялы і прозвішча, вучоная ступень, званне

Аб’ём дыпломнай работы:
Дыпломная работа – ____ старонак
Магнітныя (цыфравыя) носьбіты – _____ адзінак

**Наваполацк 20__**

* 1-02 01 02-04 – шыфр спецыяльнасці “Гісторыя. Англійская мова”
** 1-21 03 01-01 09 – шыфр спецыялізацыі “Гістарычная інфарматыка”

**ДАДАТАК Б**

**Форма задання па дыпломнай рабоце**

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**“ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ”**

**Гісторыка-філалагічны факультэт**
**Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык кафедры

___________ ________________
подпіс іцыялы і прозвішча

“____” _______________ 20___ г.

## ЗАДАННЕ ПА ДЫПЛОМНАЙ РАБОЦЕ

**Студэнту-дыпломніку групы ___________ __________________**
№ групы Прозвішча і ініцыялы

Спецыяльнасць 1-__ __ __ “____________________”
Шыфр найменне спецыяльнасці

Спецыялізацыя 1-__ __ __ ____________________
Шыфр найменне спецыялізацыі

1. Тэма работы: “_____________________________________________”
Зацверджана загадам рэктара УА “ПДУ” ад “___”____________ 20__ г.
2. Дата выдачы задання – “__” _________ 20__ г.
3. Тэрмін здачы закончанага варыянта работы – “___” ______ 20__ г.
4. Выхадныя даныя да работы:
4.1. ____________________________________________________
4.2. ____________________________________________________
5. Пералік пытанняў, якія падлягаюць распрацоўцы (задачы работы):
5.1. ____________________________________________________
5.2. ____________________________________________________
6. Кансультанты па рабоце з пазначэннем раздзелаў, якія да іх належаць:
6.1.____________________________________________________
6.2.____________________________________________________
7. Каляндарны графік работы за ўвесь перыяд з пазначэннем тэрмінаў выканання асобных этапаў:
7.1.____________________________________________________
7.2.____________________________________________________

Кіраўнік ___________ ___________________
подпіс, дата ініцыялы і прозвішча, вучоная ступень, званне

Студэнт-дыпломнік
прыняў да выканання ___________ ___________________
подпіс, дата ініцыялы і прозвішча

**ДАДАТАК В**

**Прыклад афармлення рэферата**
**да дыпломнай работы**

**РЭФЕРАТ**

Дыпломная работа: 55 с., 11 мал., 19 табл., 21 крыніца, 4 дадаткі.

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XIII – XIV СТСТ., ВЯЛІКАКНЯЖАЦКАЯ ЎЛАДА, НАВАГРАДАК, ВІЛЬНЯ, ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аб'ектам даследавання з'яўляецца ...

Мэта работы ...

У працэсе работы выкананы наступныя віды даследавання ...

Элементамі навуковай навізны (практычнай значнасці) атрыманых вынікаў з'яўляюцца ...

Сферамі магчымага практычнага выкарыстання з'яўляюцца ...

Студэнт-дыпломнік пацвярджае, што прыведзены ў дыпломнай рабоце матэрыял аб'ектыўна адпавядае аб'екту даследавання, усе запазычаныя з літаратурных і іншых крыніц тэарэтычныя і метадалагічныя палажэнні і канцэпцыі суправаджаюцца спасылкамі на іх аўтараў.

## ДАДАТАК Г

### Прыклад афармлення спіса крыніц і літаратуры

(згодна з патрабаваннямі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь)

| Характарыстыка крыніцы | Прыклад афармлення |
|---|---|
| Адзін ці болей аўтараў | Дук, Д. У. Полацк XVI – XVIII стст.: нарысы тапаграфіі, матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 268 с.: іл. |
| | Здановіч, Н. І. Беларуская паліваная кераміка XI – XVIII ст. / Н. І. Здановіч, А. А. Трусаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 183 с. |
| Дадаткі да шматтомнага выдання | Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён: Дадат. да 6-томнай “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” / аўтар тэкста Л. І. Языковіч; склад.: Г. Р. Шыкунова, Л. У. Языковіч. – Мінск : БелЭн, 2004. – 160 с.: іл., карт. |
| Састаўная частка кнігі | Штыхаў, Г. В. Мураванае дойлідства / Г. В. Штыхаў // Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст.) / Я. Г. Звяруга, Т. М. Каробушкіна, П. Ф. Лысенка, Г. В. Штыхаў; навук. рэд. П. Ф. Лысенка. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – С. 467 – 478. |
| Састаўная частка зборніка | Лобач, У. А. Сімволіка дарогі ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (паводле этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў Лепельшчыны) / У. А. Лобач // Лепельскія чытанні (другая навукова-практычная канферэнцыя). – Лепель, 2006. – С. 31 – 33.<br>Філіпенка, У. С. Гістарыяграфія вывучэння народнай медыцыны беларусаў Падзвіння / У. С. Філіпенка // Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / склад. У. А. Лобач, У. С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – С. 8 – 15. |
| Састаўная частка часопіса | Duk, D. The State, Actual Problems and Perspectives of Development of the Archaeology of Polotsk / D. Duk // The Marine Archaeology of the Baltic Sea Area (IV). – 2002. – P. 22 – 25.<br>Філіпенка, У. С. Анатамічна-фізіялагічныя ўяўленні, этыялогія і прафілактыка хвароб у сістэме традыцыйнай народнай медыцыны беларусаў Падзвіння / У. С. Філіпенка // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. 2007. – С. 26 – 34. |

| | |
|---|---|
| Састаўная частка энцыклапедыі | Штыхаў, Г. В. Полацкая архітэктурная школа / Г. В. Штыхаў, Ю. А. Якімовіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 507. |
| Састаўная частка газеты | Дук, Д. Полацк. Калыска беларускай дзяржаўнасці / Д. Дук // Полацкі веснік. – 2003. – №№ 65 – 66. – С. 6. |
| Электронныя рэсурсы лакальнага доступа | Oxford interactive encyclopedia [Электронный ресурс]. – Электрон. дан. і прогр. – [Б.м.]: The Learning Company, 1997. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM): Зв., цв.; 12 см. – Систем. требования: ПК с процессором 486+; Windows 95 или Windows 3.1; дисковод CD-ROM; зв. карта. – Загл. с этикетки диска. |
| Электронныя рэсурсы аддаленага доступа | Российская государственная библиотека [Электронный ресурс] / Центр информ. технологий РГБ; ред. Т. В. Власенко; web-мастер Н. В. Козлова – Электрон. дан. – М. : Рос. гос. б-ка, 1997. – Режим доступа: http: //www.rsl.ru, свободный. – Загл. с экрана. – Яз. рус., англ. |
| Архіўныя матэрыялы | Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (НГАБ). Фонд 1823 “Полацкі магістрат”. Вопіс 1. Спр. 2.<br>Российский государственный архив древних актов (РГАДА). Фонд 389 “Литовская метрика”. Вопіс 1. Спр. № 573. |
| Запісы палявых этнаграфічных матэрыялаў | Запісана Івановым К. А. у 2010 г. ад Яцкевіч Ганны Паўлаўны, 1932 г. н. у в. Касмыры Докшыцкага р-на. |

**ДАДАТАК Д**

**Узор афармлення зместа дыпломнай работы**
(на прыкладзе тэмы “Гісторыя кніжных збораў і бібліятэк
на тэрыторыі Беларусі (XI – XIX стст.)”)

ЗМЕСТ[1]


Пералік умоўных абазначэнняў і тэрмінаў[2] ........................................ 5

Уводзіны ........................................................................................ 6

1. Бібліятэкі Старажытнай Русі .................................................... 9
2. Бібліятэкі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай .................... 22
2.1. Манастырскія бібліятэкі ............................................................ 22
2.2. Прыватныя бібліятэкі ................................................................ 29

3. Бібліятэкі на тэрыторыі Беларусі напрыканцы XVIII – XIX стст. ..........37
3.1. Манастырскія бібліятэкі ............................................................ 37
3.2. Публічныя бібліятэкі ................................................................ 40
3.3. Бібліятэкі навучальных устаноў .................................................. 45
3.4. Асабістыя бібліятэкі ................................................................ 47

4. Праблемы рэстытуцыі і рэканструкцыі бібліятэчных збораў ............... 51

Заключэнне ...................................................................................... 58
Спіс выкарыстаных крыніц .................................................................. 61
Дадатак А ........................................................................................ 64
Дадатак Б ........................................................................................ 66


[1] Перад зместам змяшчаюцца структурныя часткі “Тытульны ліст”, “Заданне па дыпломнай рабоце”, “Рэферат”; яны ўключаюцца ў агульную нумарацыю старонак, але ў змесце не адлюстроўваюцца.
[2] Гэты структурны элемент пазначаецца пры неабходнасці.